ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
_____________ У.У.Рыжкоў
"19" лістапада 2016 г

# ЗАДАННІ
## для правядзення другога этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

Дата правядзення: 19 лістапада 2016 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 12.00.

**IX клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** Размяркуйце назвы людскіх прафесій і заняткаў у залежнасці ад месца націску: *бармен, бляхар, знахар, кравец, кухар, маляр, муляр, рымар, страхар, фурман.*

| *Словы з першым націскным складам* | *Словы з другім націскным складам* |
|---|---|
| ______________________ | ______________________ |
| | |

**Заданне 2.** Марфемны слоўнік беларускай мовы ўключае амонімы з рознай марфемнай будовай. Пасля кожнага такога слова для разумення яго сэнсу ў дужках падаецца аднакарэннае слова або сінонім. Карыстаючыся дадзенай інфармацыяй, вызначыце карані ва ўсіх словах-амонімах і запоўніце табліцу.

| *Словы-амонімы* | *Корань слова* |
|---|---|
| **Узор:** замінаць *(замяць)* | -мін- |
| развіць 1 *(пашырыць)* | |
| развіць 2 *(расправіць што-небудзь)* | |
| загадваць 1 *(загадка)* | |
| загадваць 2 *(загад)* | |
| пакаваць 1 *(каваць)* | |
| пакаваць 2 *(пакунак)* | |
| паліць 1 *(падпаліць)* | |
| паліць 2 *(налiваць)* | |
| прычыняць 1 *(прычына)* | |
| прычыняць 2 *(адчыніць)* | |
| абурыць 1 *(разваліць)* | |
| абурыць 2 *(выклікаць незадавальненне)* | |

**Заданне 3.** Вызначыце, якое агульнае слова-кампанент (у розных граматычных формах) прапушчана ў наступных фразеалагізмах:
*1) да апошняй ...;*
*2) з міру па ...;*
*3) чырвонай ...;*
*4) на жывую ...;*
*5) як ... за іголкай;*

Упішыце фразеалагізмы ў табліцу ў адпаведнасці з прыведзенымі значэннямі.

| *Фразеалагізм* | *Значэнне* |
|---|---|
| | *'патроху'* |
| | *'нетрывала, нядбайна'* |
| | *'выразна, ярка'* |
| | *'неадлучна'* |
| | *'начыста'* |

**Заданне 4.** У "Кароткай граматыцы беларускай мовы" адзначана, што ў формах роднага склону адзіночнага ліку назоўнікаў 2-га скланенняканчаткі *-а (-я)* і *-у (-ю)* ужываюцца для адрознення значэння назоўнікаў. Напрыклад, *лістапада* (назва месяца) і *лістападу* (час ападання лісця ўвосень). Устанавіце, якія назоўнікі маюць пададзенае значэнне і з якім канчаткам яны ўжываюцца ў родным склоне.

| **№** | **Значэнне слова** | **Слова ў форме роднага склону адзіночнага ліку** |
|---|---|---|
| I | 1) прыстасаванне, прыбор | |
| | 2) сукупнасць органаў, якія выконваюць пэўную функцыю | |
| II | 1) нацыя | |
| | 2) шмат людзей | |
| III | 1) форма тулава, постаць чалавека | |
| | 2) лагер, месца стаянкі | |
| IV | 1) след, прыкмета | |
| | 2) метка, канкрэтнае абазначэнне, літара | |
| V | 1) будынак | |
| | 2) радня, родныя мясціны | |

**Заданне 5.** Знайдзіце лішні элемент у кожным радзе. Выпішыце яго і патлумачце, чаму ён лішні.

| | *Лішні элемент* | *Прычына* |
|---|---|---|
| 1. Байка, паэма, элегія, балада. | | |
| 2. Анапест, амфібрахій, ямб, дактыль. | | |
| 3. М. Танк "Шчасце"; А. Куляшоў "Бывай"; А. Вярцінскі "Жыццё даецца, каб жыццё тварыць"; С. Грахоўскі "Чалавеку патрэбна не слава". | | |
| 4. "Магіла льва", "Паўлінка", "Спадчына", "На Каляды к сыну". | | |

**Заданне 6.** У літаратурна-крытычным артыкуле "За тры гады" (1913) Максім Багдановіч даў характарыстыку беларускаму прыгожаму пісьменству. Запішыце фрагменты гэтага артыкула ў адпаведнасці з арфаграфічнымі нормамі сучаснай беларускай мовы. Здагадайцеся, якіх пісьменнікаў характарызаваў М. Багдановіч.

| **Фрагмент артыкула** | **Запіс у адпаведнасці з нормамі сучаснай беларускай мовы** |
|---|---|
| **А.** С таго, што было надрукавана у апошніе тры гады, асаблівую увагу звертаюць на сябе (апрыч дробных вершоў) вершы | |

| | |
|---|---|
| апаведаньня "Лесьнікова пасада". | ___ ___ ___ |
| **Б.** Першае слова – аб <…> і яго вялікай кнізе вершоў "Шляхам жыцьця". З радасьцю бачым, што талент развіваецца, з'яўляюцца новыя мэты, новыя спосабы творчасьці, новыя формы і образы. Ня толькі нядоля нашай вёскі ды національные справы цікавяць яго. | ___ ___ ___ ___ ___ ___ ___ |

У гэтым артыкуле гаворыцца пра А)______________________ і Б)_________________________________.

**Заданне 7.** Вызначыце сінтаксічную ролю інфінітываў у вершаваных радках Максіма Багдановіча. Назавіце вершы, з якіх узяты гэтыя цытаты.

| **Радкі Максіма Багдановіча** | **Сінтаксічная роля інфінітываў** | **Назва верша** |
|---|---|---|
| *Не паняць таго ніколі, не разведаць, не спазнаць.* | | |
| *Яны, бяздольныя, узяты ткаць залатыя паясы.* | | |
| *Здалее хваляў хор на вольны свет прабіцца.* | | |
| *Вакол лятуць бары і гоні,*<br>*Ў грудзях пачала кроў кіпець.* | | |

**Заданне 8.** Прачытайце вершаваны твор Янкі Сіпакова і запоўніце табліцу.

ЯЛТА, МАКСІМ, КІПАРЫСЫ
Ён навучыў, здаецца, гаварыць
Па-беларуску нават кіпарысы,
Барвінак *на магільніку гарыстым*
_________________________________.
Паўднёва сонца плавіцца ўгары,
Зямля гарачая, *нібыта* прысак...
Ён навучыў, здаецца, гаварыць
Па-беларуску нават кіпарысы.

| | |
|---|---|
| Да якога літаратурнага роду адносіцца твор? | |
| Аднавіце прапушчаны ў вершы радок. | ___ |
| Якая сінтаксічная (стылістычная) фігура вылучана *курсівам* у трэцім радку? | ___ |
| Які сродак мастацкай выразнасці вылучаны *курсівам* у шостым радку? | ___ |
| Растлумачце лексічнае значэнне падкрэсленага слова. | ___ |

